В. М. АСТРОГА

# ВЯСКОВАЕ НАСТАЎНІЦТВА БЕЛАРУСІ Ў ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

Першая сусветная вайна аказала рэзка адмоўны ўплыў на народную адукацыю як Расіі ў цэлым, так і Беларусі ў прыватнасці. Тэрыторыю Беларусі перарэзаў фронт. Заходнія раёны ў хуткім часе былі занятыя нямецкім войскам.

Увесь цяжар вайны адчулі на сябе і народныя настаўнікі. Яны не ўвайшлі ў катэгорыю незаменных асоб і ў вялікай колькасці, хоць і не было каму працаваць у школе, прызываліся ў дзеячую армію. У 1915 г. «Наша ніва» паведамляла, што ў Беларусі «з настаўнікаў больш чым 4000 чалавек пакліканы на вайну» (у межах Расійскай імперыі мабілізацыя ахапіла 33 тысячы народных настаўнікаў) [1]. Так, са Слуцкага павета прызвалі 18 настаўнікаў, Мазырскага — 25, Рэчыцкага — 35, Бабруйскага — 48 [2]. Па Быхаўскаму павету на ваеннай службе знаходзілася 49 настаўнікаў, ці 77,7 % усёй колькасці. Іх абавязкі выконвалі 26 настаўнікаў, эвакуіраваных з Ковенскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў, і яшчэ 23 часова нанятыя асобы [3]. 26 верасня 1914 г. было прынята Палажэнне, па якім настаўнікі, што прызываліся на сапраўдную ваенную службу, захоўвалі за сабой падчас знаходжання іх у войсках пасады і мелі права на займанне іх зноў пры звальненні; усё набытае імі на пасадзе настаўнікаў утрыманне; права на залік часу, праведзенага на ваеннай службе, у тэрмін выслугі 5-гадовых прыбавак і на пенсію ў пенсійнай касе народных настаўнікаў. Такое права зацверджаным 10 верасня 1914 г. Палажэннем было прадстаўлена і настаўнікам царкоўна-прыходскіх школ з адгаворкай адносна правоў на пенсію [4]. 31 ліпеня 1915 г. быў прыняты цыркуляр, які тычыўся настаўнікаў-бежанцаў. Дырэкцыі народных вучылішчаў павінны былі ведаць іх колькасць, па магчымасці ўладкоўваць на працу, выдаваць дапамогі ў адпаведнасці з матэрыяльнай патрэбай. Удовы настаўнікаў, забітых на вайне, згодна заканадаўству, атрымлівалі пенсію па закону аб пенсіях ніжэйшым воінскім чынам у памеры 48 руб. у год.

Мабілізацыя такой вялікай колькасці настаўніцтва адмоўна адлюстравалася на працы пачатковых школ, многія з якіх вымушаны былі прыпыніць працу. «На патрэбы ваеннага часу» у распараджэнне ваенных улад шмат будынкаў навучальных устаноў было адведзена на памяшканні для раненых, ваеннапалонных, лазарэты. У сувязі з разгортваннем ваенных дзеянняў з прыфрантавой паласы ў глыб Расіі быў эвакуіраваны шэраг навучальных устаноў Беларусі, у тым ліку і настаўніцкія семінарыі. Восенню 1915 г. Свіслацкая настаўніцкая семінарыя Ваўкавыскага павета пераехала ў г. Медынь Калужскай губерні, Маладзечанская — у г. Смаленск, Нясвіжская — у г. Вязьму, Барунская з Ашмянскага павету — у г. Ціхвін Наўгародскай губерні [5]. Паралельна ішоў працэс адкрыцця новых семінарый на тэрыторыі ўсходняй Беларусі: у 1914 г. пачала працаваць Барысаўская жаночая, у 1915 г. — Гомельская, у 1916 г. — Бабруйская жаночая. Узрастаў план прыёму ў семінарыі, а самі яны пачыналі пераўтварацца ў шматкамплектныя навучальныя ўстановы. У 1916 г. у Беларусі было: 9 настаўніцкіх семінарый (каля 1000 навучэнцаў), 7 двухгадовых педагагічных курсаў (288 чалавек), 7 педагагічных класаў пры жаночых гімназіях (каля 250 вучаніц), 20 другакласных настаўніцкіх школ (каля 1420 чалавек), 2 царкоўна-настаўніцкія школы (каля 80 чалавек).

У час першай сусветнай вайны кайзераўская адміністрацыя, ажыццяўляючы сваю акупацыйную палітыку на занятай тэрыторыі, у пэўнай ступені дазволіла развівацца беларускаму школьніцтву. У 1916 г. дзейнічалі 5 беларускіх пачатковых школ, якія пазней адкрываліся па ўсёй тэрыторыі заходняй Беларусі. Для падрыхтоўкі настаўнікаў у 1915 г. у Вільні былі арганізаваны трохмесячныя педагагічныя курсы дзякуючы намаганням І. Луцкевіча і Цёткі, якія на той час мелі вопыт арганізацыі беларускай асветы. 3 верасня 1916 г. на месцы эвакуіраванай Свіслацкай семінарыі пачала працу беларуская настаўніцкая семінарыя, у якой да 1918 г. было падрыхтавана 144 педагогаў [6].

У гэты час настаўніцкія таварыствы ўзаемадапамогі, рэдакцыі педагагічных газет і часопісаў, прыватныя дзеячы народнай адукацыі аб'ядналі свае намаганні па аказанню дапамогі настаўнікам, бежанцам і школе ў цэлым. Быў створаны Камітэт дапамогі пацярпелым ад вайны, куды ўвайшлі грамадскія дзеячы, выкладчыкі навучальных устаноў, прадстаўнікі педагагічных таварystваў узаемадапамогі. Камітэт пастанавіў стварыць Лазарэт «рускага настаўніцтва», у сувязі з чым быў пачаты збор ахвяраванняў сярод шырокіх слаёў насельніцтва.

Камітэт усклаў на праўленні настаўніцкіх таварыстваў наступныя задачы: рэгістрацыя ўсіх настаўнікаў дадзенай мясцовасці, прызваных на вайну, і навядзенне аб іх справак; вызначэнне матэрыяльнага становішча пакінутых імі сямей; арганізацыя збораў ахвяраванняў і ўстанаўленне працэнтных адлічэнняў з «жалавання» у фонд забеспячэння сямей настаўнікаў, прызваных на вайну; клопаты аб замене мабілізаваных на вайну настаўнікаў.

Важную ролю ва ажыццяўленні дабрачыннай місіі ўзяў на сябе створаны восенню 1914 г. расійскі Настаўніцкі фонд дапамогі настаўнікам, пацярпелым ад вайны. Гэты фонд атрымаў падтрымку перадавой грамадскасці. У камісію паступалі адлічэнні як ад навучальных устаноў, педагагічных таварыстваў, земскіх упраў, так і ад асобных настаўнікаў. Гомельскае таварыства ўзаемадапамогі актыўна ўключылася ў яго працу [7]. Дзейнасць жа другіх педагагічных таварыстваў у гады першай сусветнай вайны пачала згортвацца. Так, са справаздачы Мінскага таварыства за 1916 г. бачна, што грашовая пазыка выдадзена толькі аднаму яе члену ў памеры 30 руб; створаныя інтэрнаты для настаўніцкіх дзяцей не працавалі, навучальныя ўстановы дзейнічалі ў абмежаванай колькасці. У 1916 г. на лік таварыства не паступалі членскія ўзносы, і па абставінах ваеннага часу не было і агульных сходаў ні ў 1915, ні ў 1916 гг. [8].

Падчас вайны значна пагоршылася матэрыяльнае становішча настаўнікаў і членаў іх сямей, якія нярэдка пазбаўляліся апошняй крыніцы існавання. З 1 лістапада 1917 г. заробак настаўнікам быў даведзены да 100 руб. у месяц, акрамя таго выдаваліся дзве прыбаўкі на дарагавізну па 10 руб. [9]. Гэтых грошай хапала толькі на такія абеды, як «суп з бульбы, 1/3 фунта хлеба і чай без цукру», «хлеб, бульба, капуста» ці «суп і малочнае нешта» [10].

Часовы ўрад, які прыйшоў да ўлады ў выніку Лютаўскай рэвалюцыі, дэкларыраваў некаторыя распараджэнні аб адмене застарэлых антыдэмакратычных пастаноў розных гадоў аб недапушчэнні да педагагічнай дзейнасці асоб, прызнаных «недабранадзейнымі» у палітычных адносінах, цыркуляраў аб недапушчэнні яўрэяў да педагагічнай дзейнасці, усіх загадаў царскіх органаў упраўлення аб абмежаванні праў на адукацыю і педагагічную працу па расавых, нацыянальных і рэлігійных матывах, аб недапушчэнні да настаўніцкай пасады без дазволу губернатара, аб забароне настаўнікам ствараць саюзы і праводзіць сходы, удзельнічаць у палітычных партыях, аб абмежаваннях на педагагічныя курсы. Прымаліся і іншыя законапраекты і рашэнні, але ў сваёй большасці яны не былі рэалізаваны [11].

Такім чынам, Першая сусветная вайна нанесла вялікія страты не толькі сельскай гаспадарцы і прамысловасці, але і народнай адукацыі. Вынікам гэтага стала акупацыя заходняй часткі Беларусі і скарачэнне колькасці пачатковых школ, эвакуацыя навучальных устаноў на ўсход, мабілізацыя вялікай колькасці настаўнікаў у армію, пагаршэнне матэрыяльнага становішча педагогаў і членаў іх сямей.

*Крыніцы і літаратура:*


1. Вучыцелі на вайне // Наша ніва. 1915. 9 красавіка. С. 4.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ), ф. 458, воп. 1, спр. 460, л. 25, 60, 70, 76.
3. НГАБ, ф. 2084, воп. 1, спр. 256, л. 17.
4. Справочник для учителей, пострадавших от войны. — Петроград: Тип. И. Флейтмана, 1915. С. 9.
5. Новик Е.К. Формирование кадров народного образования Белорусии. Мн.: Наука и техника, 1981. С. 16—17.
6. Głogowska H. Białoruś. 1914—1929. Kultura pod presją polityki. Bialystok, 1996. S. 37.
7. Сучков І.В. Социальный и духовный облик учительства России на рубеже XIX—XX веков // Отечественная история. 1995. № 1. С. 62—65.
8. НГАБ, ф. 504, воп. 1, спр. 15, л. 217.
9. НГАБ, ф. 2084, воп. 1, спр. 326, л. 1.
10. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці, ф. 324, спр. 9, л. 1, 5, 8.
11. Паначин Ф. Г. Педагогическое образование в России. М.: Педагогика, 1979. С. 202.